*Доўнар Л.І. (Мінск)*

# ПАВЕЛ ДАМЖЫЎ-ЛЮТКОВІЧ І ПАЧАТКІ КНІГАВЫДАННЯ Ў МІНСКУ

Хваля патрэбы ва ўласным кнігавыданні дакацілася да Мінска ў пачатку XVII ст. [4; 5; 16], калі значны ўплыў на гэты працэс аказалі сацыяльна-палітычныя і рэлігійныя фактары. У 1565–1569 гг. завяршаецца фарміраванне Менскага ваяводства і горад становіцца яго сталіцай, значным адміністрацыйным цэнтрам Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Неабходнасць у друкаваным слове ўзмацнялася і ў выніку рэлігійнага змагання, якое пачалося пасля Брэсцкай уніі 1596 г. паміж праваслаўнымі і уніятамі.

Асяродкам супрацьдзеяння уніі ў горадзе стаў праваслаўны манастыр Святых Пятра і Паўла. Першы ігумен Петрапаўлаўскага маннастыра – Павел Дамжыў-Лютковіч-Целіца (? – каля 1634) [13, с. 86] – іераманах, выдавец, пісьменнік. Паводле украінскіх даследчыкаў, паходзіў «із села Лютків (нині Монастирського району Львівської області), а його предки належали до вигнаних з Чехії Фердинандом І Габсбургом переселенців, які не захотіли змінити “старослов’янський обряд”» [8; 9]. Прыкладна ў канцы XVI – першыя гады XVII ст. адбыўся пострыг П. Дамжыва-Лютковіча ў манахі Кіева-Пячорскай лаўры. Са Святадухавым манастыром пры Віленскім праваслаўным брацтве звязана яго дзейнасць як актыўнага ўдзельніка антыўніяцкага руху. У 1609 г. ён быў пасланы ад брацтва на сейм у Варшаву, арганізоўваў акцыі супраць епіскапа Іпація Пацея ў Навагрудку [13, с. 30]. Важным сродкам барацьбы стала і друкаванае слова, да прадукавання якога П. Дамжыў-Лютковіч таксама далучаецца ў Вільні. У 1610 г. разам з Лявонціем Карповічам ён выпусціў палемічны і самы рэзанансны ў той час твор Мялеція Сматрыцкага Трэнас (Плач), дзе ад імя праваслаўнай мацеры-царквы, якая сімвалізавала прыгнечаную радзіму, аўтар заклікаў беларускі і ўкраінскі народы да аб'яднання супраць каталіцкай экспансіі. У адказ кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III выдаў загад аб канфіскацыі друкарні і арышце выдаўцоў [9, с. 116–117]. На два гады трапіў у вязню Лявонцій Карповіч, друкарня была перанесена ў Еўе, пакінуў Вільню і Павел[1] [10]. Акрамя

[1] Па меркаванні Я. Ісаевіча, перахоўваўся на Валыні ў Дзерманскім манастыры [6, с. 197–203].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рэдакцыйна-літаратурнай дзейнасці ў сўеўскай друкарні[2] па даручэнні Віленскага Святадухава брацтва ў 1611–1617 гг. П. Дамжыў-Лютковіч займаецца арганізацыяй філіі брацтва ў Мінску, будаўніцтвам Петрапаўлаўскага манастыра, а з 1613 па 1617 г. з'яўляецца яго ігуменам [13, с. 86]. Цікава, што адным з уплывовых фундатараў-заснавальнікаў праваслаўнага манастыра і брацтва ў Мінску быў князь Багдан Мацвеевіч Агінскі, у маёнтку якога ў Еўі працавала друкарня віленскага Святадухава манастыра [6].

Не выключана, што ў гэты час магло ставіцца і пытанне аб адкрыцці друкарні пры Петрапаўлаўскім саборы ў Мінску. Аднак той вядомы факт, што П. Дамжыў-Лютковіч у 1618 г. пачаў самастойную выдавецкую дзейнасць, заснаваўшы ўласны друкарскі варштат, з якім ён і яго паплечнік іерадыякан Сільвестр вандравалі па Украіне і па/праз Беларусь, хоць і не вырашае адназначна гэта пытанне, але не выключае таго, што першапачатковым месцам іх працы мог быць менавіта Петрапаўлаўскі манастыр у Мінску. Калі дапусціць, што абсталяванне для друку было набыта ў Еўі (ці Вільні), а на ўкраінскія землі, «певне, до Угорців Лютковнч приїхав вже з готовою друкарнею» [14, с. 173], то верагодней выглядае іх прысутнасць з друканяй у Мінску прыкладна ў 1616–1617 гг. Аднак, як відаць, у горадзе склаліся неспрыяльныя ўмовы для друкароў: з аднаго боку, узмацняецца ціск уніятаў на праваслаўных, з іншага – неабходны былі сродкі на друкарскую дзейнасць. Не выключана, як мяркуе І. Агіенка [14, с. 173], што праваслаўны магнат Аляксандр Фёдаравіч Шаптыцкі, уладальнік Угорцаў (на Львоўшчыне), асабіста запрасіў друкароў да сябе і стаў фундатарам трох іх выданняў, якія выйшлі ў 1618–1620 гг.[3]

У канцы 1621 г., пасля смерці фундатара А.Ф. Шаптыцкага, П. Дамжыў-Лютковіч з Сільвестрам вяртаюцца ў Мінск [10; 14]. У гэты час ігуменам Петрапаўлаўскага манастыра з'яўляўся Гедэон [13, с. 86], але, магчыма, праблемы па завяршэнні будаўніцтва манастыра, што ўзніклі з-за супрацьдзеяння ўніятаў, патрабавалі падтрымкі, і яе мог аказаць П. Дамжыў-Лютковіч, ці ён сам таксама шукаў падтрымкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[2] Вядома, напрыклад, выданне П. Дамжыва-Лютковіча «Молитвы повседневные» (Еўе, 1615).

[3] «Краткий сборник слов из божественного Писания и с объяснением изложения святыми апостолами двенадцати артикулов православной веры» (1618), «Часослов» и «Молитвенник» з «Кратким хронологическим летописцем» (1619), «Апостолы и евангелия на все воскресения, праздники и избранных святых» (1620).

для сваёй выдавецкай справы. Праўда, акармя гіпотэзы ёсць і зафіксаваная версія прычыны ад'езду друкароў з Угорцаў – гэта татарскі напад. Змешчана ўласна друкарамі ў выданні «Казанье на чиненю памяти по зешлом его милости пану Александрови Феодоровичу Шептицком, през през отца Павла Домжива Лютковича игумена менского отправованое месяца декабря 20 в року 1622» [6, с. 197–203]. Няма адназначнай думкі ў даследчыкаў наконт месца друку «Казанья», складзенага П. Дамжывам-Лютковічам да гадавіны смерці А.Ф. Шаптыцкага і з прысвячэннем родным былога фундатара, тым не менш Мінску не адмаўляецца ў гэтым праве, што засведчана і ў зводным каталогу «Кніга Беларусі, 1517–1917» [7, с. 96].

Мінск, аднак, не стаў спрыяльным месцам для працягу выдавецкай дзейнасці П. Дамжыва-Лютковіча – тут усё большую сілу набіраў уніяцкі рух. Таму ізноў праваслаўныя друкары вымушаны шукаць іншы прытулак, якім становіцца Валынь, дзе ў 1625–1629 гг. П. Дамжыў-Лютковіч і Сільвестр выпусцілі наступныя пяць выданняў пры падтрымцы Грыгорыя Святаполка-Чацвярцінскага (у в. Чацвяртня[4] і Луцку[5]) і Адама Урсул-Рудзецкага (у в. Чорная[6]) [10]. Павел Дамжыў-Лютковіч з'яўляўся не толькі выдаўцом, але і аўтарам некаторых сваіх палемічных твораў, прадмоў, вершаў на гербы асоб, якім прысвячаліся тыя выданні. З 1628 г. выконваў абавязкі ігумена новазаснаванага манастыра ў в. Чорная, займаўся таксама настаўніцкай дзейнасцю у школе Луцкага праваслаўнага брацтва [17], куды пасля яго смерці і трапіў друкарскі варштат.

У 1630–1650-я гг. праваслаўнае брацтва ў Мінску мела шанцы далучыцца да выдавецкай дзейнасці. А менавіта, найперш, дзякуючы дараванаму каралеўскаму прывілею Уладзіслава IV ад 18.III.1633 г. аб «...друкаванні ўсялякіх кніг і захаванні ў іх людзей годных як духоўных, так і свецкіх»[7] [19, с. 256; 20, с. 24]. На думку польскіх

---

[4] Псалтырь (1625).

[5] «Плач по свято умершему… Иоанну Васильевичу пресвитеру» (1628) – паэтычны зборнік; «Эпидикион, или стихи скорбные на погребение Василисы Яцкивны» Сцяпана Полумеркавіча (1628) – вершы.

[6] «Часослов» (1629), «Диалог, или Разговор человека больного или умирающего ли со своим духом» (1629) – пераклад [П. Дамжыва-Лютковіча?] з польскай мовы твора каталіцкага ксяндза Станіслава Рэшкі.

[7] Праўда, указаны прывілей адсутнічае ў сучасным польскім выданні : Privilegia typographica Polonorum. Polskie przywileje drukarskie 1493–1793 / ed. Maria Juda. Lublin, 2010. 474 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследчыкаў, «Być może, było to automatyczne powtórzenie z przywileju wileńskiego i bractwo wcale nie zamyślało o uruchomieniu warsztatu» [21, с. 168]. Аб тым, што праваслаўнае брацтва пры Петрапаўлаўскім манастыры мела права на друк пісаў і архімандрыт Мікалай: «В 1650 г. король Владислав VI дал свою привилегию братству, училищу, типографии и гошпиталю Минского Петропавловского монастыря. Печатались ли какие именно книги в этой типографии – это также неизвестно (Собр. М. Гр. гр. 62 и 123)» [13, с. 86; 19]. І да сённяшняга дня невядомы ні самі мінскія выданні гэтага часу, ні іншыя архіўныя звесткі адносна дзейнасці друкарні Мінскага праваслаўнага брацтва нават як філіі Віленскага. Мінскія братчыкі тым не менш маглі падтрымліваць выданне пэўных твораў Віленскага брацтва (як у Вільні, так і ў Еўі), карысталіся іх прадукцыяй (напрыклад, для брацкай школы, што існавала ў Мінску з 1613 г.) [2, с. 17].

Наступнымі прэтэндамі на ролю пачынальнікаў кнігавыдання ў Мінску з'яўляюцца ўніяты. На пачатаку XVII ст. у Мінску быў заснаваны базыльянскі кляштар і адкрыта «тэалагічная ўстанова» (каля 1615 г.) [12], якая ў хуткім часе стала пераўзыходзіць нават Троіцкую семінарыю ў Вільні. Мінскія ўніяты таксама маглі мець уласную друкарню: ці ў 1616 г. [4], ці пазней, каля 1650 г. – пасля ажыццяўлення пастановы 4-й кангрэгацыі базыльянскага ордэна (1626 г.) аб заснаванні ў Мінску адмысловай уніяцкай духоўнай семінарыі [1, с. 31]. Як сцвярджае Дзмітрый Лісейчыкаў, «[…] у сярэдзіне XVII ст. тут [у Мінску – *Л. Д.*] існавала некалькі парафіяльных цэркваў і кляштараў, працавала духоўная семінарыя, дзейнічала друкарня» [11]. Праўда, базыльянскіх выданняў XVII ст., якія маглі быць надрукаванымі ў Мінску, да гэтага часу не выяўлена.

Сярод неажыццёўленых выдавецкіх ініцыятыў пачатку XVIII ст. – ініцыятыва, якая была выказана і нават абгрунтавана мінскай інтэлігенцыяй у 1707 г.: гэта неабходнасць мясцовага друку (газеты) і распаўсюджвання праз пошту бясплатных перыядычных выданняў [18, с. 60]. Аднак у даным выпадку перашкодай стала працяглая Паўночная вайна (1700–1721), у выніку якой хоць і абвастрылася такая патрэба зносін, але яе рэалізацыя аказалася не простай справай. З іншага боку, магчыма, дадзеная ініцыятыва ўзнікла «не на пустым месцы» і пад увагу мог брацца ўжо існуючы ў горадзе (з XVII ст.) друкарскі варштат ордэна базыльянаў.

Паводле меркавання У. Дзянісава, базыльянская друкарня пры СвятаДухавым манастыры існавала кароткі час – у пачатку XVII ст., а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паўторна ўзнавіла сваю працу ў 1790 г. [4; 5]. Праўда, у архімандрыта Мікалая, напрыклад, указана толькі, што «в 1790 г. Польский король Станислав Август позволил учредить типографию при сем монастыре» [13, с. 94] і не болей.

Выданні мінскай друкарні ордэна базыльян XVIII ст. атрымалі адлюстраванне ў вядомых польскіх і беларускіх бібліяграфічных і навуковых працах, некаторыя з іх захоўваюцца ў Польшчы, ёсць копія аднаго выдання ў Беларусі. Па сабраных (і папярэдніх) бібліяграфічных звестках, зафіксаваных таксама і ў бібліятэчных каталогах, аб выданнях мінскіх базыльян складваецца наступная карціна. Датуюцца друкі 1784 (?) – 1794 гг., іх налічваецца 22 (?) назвы, першынство належыць свецкай літаратуры[8], сярод якой афіцыйных выданняў – 14 назваў; твораў мастацкай тэматыкі – 3; па асвеце – 2 і рэлігійных толькі 3; 20 з іх – на польскай мове, 1 – на лацінскай, 1 – на рускай [3].

Такім чынам, першы друкарска-выдавецкі вопыт Мінска ў XVII ст. і пад канец XVIII ст., у вытокаў якога знаходзяцца дзве хрысціянскія плыні – праваслаўныя і ўніяты, быў накіраваны пераважна на спраўджванне адпаведных рэлігійных і найболей афіцыйных замоў, уласныя патрэбы выдаўцоў і, у некаторай ступені, на патрэбы мінскай грамадскасці ў справе арганізацыі дзяржаўнага кіравання, адукацыі і асветы; быў эпізадычным і нязначным.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Археографический** сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленскаго Учебнаго Округа. – Вильна : Печатня Губернского правления, 1867–1904. – Т. 12 : [документы 1617–1709] : Типография А. Г. Сыркина, 1900. – XLVII, 230 с.

2. **Галенчанка, Г. Я.** Старадрукаваныя кірылічныя кнігі 16–18 ст. // Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог. – Мінск, 1986. – С. 17.

3. **Доўнар, Л. І.** Выданне рэлігійных кніг у Мінску ў XIX – пачатку XX ст. / Л. І. Доўнар // VIII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (Мінск, 23–26 мая 2002 г.). – Мінск, 2003. – С. 58–67.


---

[8] Агульныя звесткі аб выдавецкай прадукцыі базыльянскіх друкарняў у Вільні, Супраслі, Мінску, Львове, Пачаеве датуюцца 1628–1800 гг. – гэта ўсяго 1080 кніг, якія выходзілі у асноўным на польскай, лацінскай, царкоўнаславянскай мовах, 40% – свецкая літаратура [15].

4. **Дзянісаў, У. М.** Комплекс базыльянскіх манастыроў у Мінску / У. М. Дзянісаў // Помнікі старажытнабеларускай культуры : новыя адкрыцці / рэд. С. В. Марцэлеў. – Мінск, 1984. – С. 118–126.

5. **Дзянісаў, У. М.** Мінск (Менск). Царква Святога Духа. – Рэжым доступу: http://www.r adzima. org/be/minsk/7084.html.

6. **Ісаєвич, Я.** Українське книговидання : витоки, розвиток, проблеми / Ярослав Ісаєвич. – Львів : Інститут українознавства ім. І. Крип'якевича НАН України, 2002. – 520 с.

7. **Кніга** Беларусі (1517–1917) = Книга Белоруссии (1517–1917) : зводны каталог / [склад. : Г. Я. Галенчанка і інш.] – Мінск : БелСЭ, 1986. – 614, [1] с., [12] л. іл.

8. **Колосова, В. П.** Иван Вышенский и Павел Домжив-Люткович // Федоровские чтения, 1979. – Москва, 1982. – С. 24–34.

9. **Колосова, В. П.** Новые данные к биографии Павла Домжив-Лютковича // Федоровские чтения, 1982. – Москва, 1987. – С. 115–121.

10. **Кралюк, П.** Книга – путь к спасению. Первопечатник Павел-Домжив-Люткович-Телица и его сподвижник Сильвестр [Электронный ресурс] / Пётр Кралюк http://www.day.kiev.ua/ru/article/istoriya-i-ya/kniga-put-ko-spaseniyu. – Дата доступу: 22.07.2005. – Заглавие с экрана.

11. **Лісейчыкаў, Д.** Уніяцкія парафіі Мінска ў XVII–XIX стст. // Нашыя святыні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысв. 500-годдзю Мінск. фарн. касцёла, 225-годдзю Магілёўск. Архідыяцэзіі, 220-годдзю Мінскай дыяцэзіі, Мінск, 7 чэрвеня 2008 г. / Польскі інстытут у Мінску ; рэдкал: Т. Кандрусевіч [і інш.] ; навук. рэд.: Т. Кандрусевіч, А.І. Мальдзіс і М. Каламайска. – Мінск, 2009. – С. 138–150.

12. **Марозова, С. В.** Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады) / пад навук. рэд. У. М. Конана ; Гродз. дзярж. ун-т імя Я. Купалы. – Гродна : [Гродзен. дзярж. ун-т імя Я. Купалы], 2001. – 352 с.

13. **Николай, архимандрит.** Историко-статистическое описание Минской епархии. – Санкт-Петербург : В типографии духовного журнала «Странникъ», 1864. – 328 с.

14. **Огієнко, І. І.** Історія українського друкарства. – Київ : Либідь, 1994.

15. **Пазднякоў, В.** Базыльяне / Валерый Пазнякоў // Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя. – Мінск, 2005. – Т. 1. – С. 279.

16. **Палеес, С.** З гісторыі друкарскай справы ў Мінску // Беларусь. – Мінск, 1957. – № 9. – С. 26.

17. **Сербов, Б. Н.** Братские школы [Электронный ресурс] / Б. Н. Серов. – Режим доступа: http://www.pravenc.ru/text/153351.html. – Дата доступа: 22.03.2013. – Заглавие с экрана.

18. **Слука, А. Г.** Беларуская журналістыка : вучэб. дапам. : у 3 ч. / А. Г. Слука. – Мінск : БДУ, 2000. – Ч. 1.

19. **Собрание** древних грамот и актов Минской губернии, православных монастырей и по разным предметам. – Минск : Губ. тип., 1848.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

20. **Триста** лет в православии (Исторический очерк трехсотлетия существования Минского Екатерининского собора) / сост. П. Афонский. – Минск : Электротип. С. А. Некрасова, 1913.
21. **Drukarze** dawnej Polski od XV do XVIII wieku. Zesz. 5 : Wielkie Księstwo Litewskie / A. Kawecka-Gryczowa, K. Korotajowa, W. Krajewski. – Wrocław ; Kraków : Ossolineum, 1959.

*Статья посвящена вопросам начала книгоиздания в Минске в XVII–XVIII вв., приводятся авторские гипотезы, результаты собственных исследований.*

*The article describes the origins of book printing in Minsk in 17$^{th}$ – 18$^{th}$ centuries, contains copyrights hypothesis and results of their own research.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Трифонова Н.Я.*** *(Минск)*

## О ХУДОЖЕСТВЕННЫХ ОСОБЕННОСТЯХ КНИЖНОЙ ПРОДУКЦИИ КУТЕИНСКОГО МОНАСТЫРЯ ВТОРОЙ ТРЕТИ XVII в.

Возникновение Кутеинского монастыря было связано с деятельностью могилевского братства, направленной на сохранение традиций православия. Его члены после попыток строительства церкви в Могилеве, не увенчавшихся, однако, до 1633 г. успехом, задумали основать центр своей деятельности в имении подкомория мстиславского Богдана-Федора Стеткевича близ Орши и получили в 1620 г. разрешительную грамоту от патриарха Иерусалимского Феофана. Богдан-Федор Стеткевич и его жена Елена Соломерецкая пожаловали монастырю «... село Кутейню с приселком под Дубцами ... а особливе свою часть тогож имени земли Белковское ...» [2, с. 41]. Около 1630 г. в нем уже существовала церковь, так как в фундуше Анны Стеткевичевой и Яна Стеткевича (около 1630 г.) идет речь о передаче «... чернецам монастыря церкви Рождества Христова ... Иоилю Труцевичу и всем законникам монастыря Кутеинского ... слободы Белковщизны» с правом строить церковь и школу [1, с. 520–524]. Церковь Рождества Христова, очевидно, называлась также Свято-Духовской.